# КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ЎРОКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

| | Крытэрыі | Паказчыкі |
|---|---|---|
| 1. | Мэты і задачы ўрока | вызначэнне навучальных (кагнітыўных) мэт (задач) урока (заняткаў) на аснове прадметнай канцэпцыі і вучэбнай праграмы |
| | | дыягнастычнасць пастаноўкі мэты |
| | | вызначэнне задач асобаснага развіцця і магчымасцей іх рэалізацыі праз стварэнне развіццёвых вучэбных сітуацый; |
| | | далучэнне вучняў да пастаноўкі адукацыйных мэт (задач) урока (заняткаў) |
| | | пастаноўка задач кожнага этапу ўрока |
| 2. | Рэалізацыя прадметнага зместу | *Прынцыпы рэалізацыі зместу моўнага матэрыялу як сродку засваення культурных каштоўнасцей (лексічнае, фразеалагічнае, граматычнае, стылістычнае багацце і разнастайнасць):* прынцып адзінства і ўзаемасувязі мовы, маўлення і мыслення |
| | | узаемасувязі развіцця вуснага і пісьмовага маўлення |
| | | прынцып актыўнай камунікацыі |
| | | прынцып апоры на тэкст у яго жанрава-стылявой разнастайнасці |
| | | *Фарміраванне і развіццё:* моўнай кампетэнцыі — засваенне сістэмы мовы (фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу), заканамернасцей і правілаў функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормаў беларускай літаратурнай мовы, авалоданне спосабамі дзейнасці, неабходнымі для асэнсавання законаў і фактаў мовы |
| | | камунікатыўнай кампетэнцыі — авалоданне маўленчай тэорыяй (тэкст, тыпы, стылі і жанры маўлення) і культурай маўлення, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў |
| | | лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі — усведамленне мовы і валоданне ёй як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры, як сродкам спасціжэння айчыннай і сусветнай культуры; здольнасць карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін |
| 3. | Валоданне метадамі выкладання прадмета | пазнавальныя метады: *тлумачальныя і эўрыстычныя* (назіранні над моўнымі з’явамі, лінгвістычны аналіз і інш.) |
| | | метады фарміравання культуры маўлення, развіцця звязнага маўлення вучняў: *камунікатыўна-пазнавальныя* (лекцыя, паведамленне, гутарка, з дапамогай якіх засвойваюцца тэарэтычныя веды) |
| | | *камунікатыўна-практычныя* (метады слоўнікавай працы, фарміравання граматычнага ладу маўлення і засваення літаратурных нормаў, навучання стварэнню звязных выказванняў розных тыпаў, стыляў і жанраў) |
| | | *метады кантролю* (вуснае апытанне, дыктант, пераказ, сачыненне, тэст і г.д.) |

| | | |
|---|---|---|
| | | практычныя метады: *метады фарміравання вучэбна-пазнавальных і правапісных уменняў і навыкаў вучняў* (знаходжанне моўных з’яў, класіфікацыя, дыферэнцыяцыя і сістэматызацыя, канструяванне, моўныя разборы, розныя віды навучальных дыктантаў і г.д.) |
| | | *метады замацавання ведаў* (пытанні для асэнсавання, засваення і замацавання; складанне плана, тэзісаў, канспекта, табліц; паведамленне на лінгвістычную тэму і г.д.) |
| 4. | Арганізацыя дзейнасці вучняў | валоданне настаўнікам прыемамі і сродкамі матывацыі, арганізацыі і стымулявання дзейнасці |
| | | праяўленне ўзроўню вучэбнай дзейнасці (рэпрадуктыўны, прадуктыўны, творчы) |
| | | дыферэнцыяцыя і індывідуалізацыя вучэбнай дзейнасці; стварэнне сітуацыі поспеху; уключэнне вучняў у адукацыйны працэс, іх арганізаванасць, актыўнасць, зацікаўленасць |
| | | эфектыўнасць прымянення індывідуальных, групавых і калектыўных форм арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці |
| | | стварэнне ўмоў для эфектыўнага ўзаемадзеяння з аднакласнікамі |
| 5. | Кантрольна-ацэначная і рэфлексійная дзейнасць | арганізацыя зваротнай сувязі на кожным этапе ўрока |
| | | выкарыстанне самаацэнкі і ўзаемаацэнкі |
| | | ацэнка індывідуальнай, групавой і калектыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; крытэрыяльнасць і аргументаванасць выстаўлення адзнак на ўроку або іх адсутнасць |
| | | правядзенне рэфлексіі (кагнітыўнай, дзейнаснай) |
| | | адпаведнасць выніковага кантролю кагнітыўным мэтам і задачам асобаснага развіцця; узаемасувязь выніковага кантролю і карэкціруючай функцыі дамашняга задання |
| 6. | Прафесійныя і асобасныя якасці педагогаў | стварэнне спрыяльнага псіхалагічнага клімату |
| | | уменне ўзаемадзейнічаць у адукацыйным працэсе (арганізатарскія ўменні) |
| | | захаванне нарматыўных патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу |
| | | імправізацыя і кіраванне адукацыйны працэсам у адпаведнасці з сітуацыяй |
| | | эфектыўнасць выкарыстання сродкаў навучання |
| | | валоданне класам (групай); эмпатыя, уменне бачыць усіх і кожнага |
| | | стыль зносін, тэхніка маўлення; камунікатыўныя якасці педагога |
| | | педагагічны такт |
| | | эрудыцыя |
| | | уменне кіраваць уласным эмацыянальным станам |